

Вадзім Гурман, фота rh.by

ВАДЗІМ ГУРМАН

Дата нараджэння: 17 траўня 1999

Дата затрымання: 11 жніўня 2020

Прад'яўленыя абвінавачванні:

арт. 342 Крымінальнага кодэкса — Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх
арт. 364 Крымінальнага кодэкса — Гвалт альбо пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў

Вынік суда: 3 гады і 6 месяцаў

Від пакарання: пазбаўленне волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму

Суддзя: Дубовік Вольга

Пракурор: Габруковіч Сяргей

Месца зняволення: ПК № 9

Заява аб прызнанні палітвязнем

Вадзім Сяргеевіч Гурман нарадзіўся ў Маладзечне ў 1999 годзе. Яго абвінавацілі па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу: **ч. 1 арт. 342** (Арганізацыя або актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак) і **арт. 364** (Гвалт альбо пагроза прымянення гвалту ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў).

Згодна з абвінавачваннем, 9 жніўня Гурман актыўна ўдзельнічаў у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве і не падпарадкоўваўся супрацоўнікам органаў унутраных спраў. Гурман выкрыкваў лозунгі, правакаваў грамадзян на актыўныя дзеянні, а таксама пагражаў гвалтам міліцыянерам Смаленскаму, Лазару, Радзько, Сіняўскаму, Нехвядовічу, Цярэньцьеву.

На судзе Гурман прызнаў віну па артыкуле 342, але не па 364-м. Ён распавёў, што пры затрыманні АМАПам, якое адбылося праз два дні 11 жніўня, яго і іншых білі і залілі газам твар. Затым моцнае збіццё працягнуліся ў двары РУУС. Па словах Гурмана, яму


Падтрымаць «Вясну»

8 лютага 2021 года ў судзе Маладзечанскага раёна суддзя Вольга Дубовік прысудзіла Гурману **тры гады і шэсць месяцаў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.**

Палітвязень у горацкай калоніі № 9 прызнаны "злосным парушальнікам рэжыму". У сярэдзіне студзеня 2022 з'явілася інфармацыя аб тым, што Вадзім на пяць месяцаў быў змешчаны ў памяшканне камернага тыпу.

За першыя некалькі месяцаў 2023 г. ён адбыў як мінімум 35 сутак у ШІЗА, 21 з якіх — бесперапынна. Апошнія 14 сутак яму прызначылі за адмову зняцца ў відэа для камісіі па памілаванні, падчас якога трэба было прызнаць сваю віну: палітвязень прынцыпова адмовіўся, бо не лічыць сябе вінаватым. Былыя вязні ў сярэдзіне красавіка 2023 г. распавялі, што хлопца перад Вялікднем зноў змясцілі ў ПКТ тэрмінам на шэсць месяцаў, дзе будуць утрымліваць аднаго ўвесь час.

Вядома, што ў красавіку 2023 г. супрацоўнікі калоніі збівалі хлопца нагамі на працягу шасці гадзінаў, а потым халоднай вадой прыводзілі яго ў пачуцці. Супрацоўнікі нават суправаджаюць Вадзіма ў калоніі, каб той не камунікаваў з іншымі вязнямі. У яго вельмі моцна пагоршылася здароўе, хлопец амаль нічога не бачыць.



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

У лютым у яго выявілі пупочную кілу (выпінанне органаў унутранай паражніны праз пярэднюю сценку жывата з прычыны слабасці цягліц зоны пупочнага кольца). Але начальнік калоніі Сяргей Петраковіч адмовіў Вадзіму ў аперацыі па выдаленні кілы. Аднак, нягледзячы на сурёзныя праблемы са здароўем, Вадзім працягваў працаваць на леспрамзоне — разгружаў дрэва з вагонаў.



Жыхара Маладзечна судзяць за ўдзел у акцыі 9 жніўня і заклікі да гвалту

У судзе Маладзечанскага раёна праходзіць разгляд крымінальнай справы па падзеях 9 жніўня. Маладзечанца Вадзіма Гурмана абвінавачваюць у тым, што ён правакаваў натоўп на актыўныя дзеянні супраць міліцыі і ў пагрозах гвалтам міліцыянерам.



Абвінавачаны маладзечанец Гурман пра сваё затрыманне: "Пагражалі згвалтаваннем, спрабавалі зняць штаны".

У судзе Маладзечанскага раёна 19 студзеня прадоўжыўся разгляд крымінальнай справы маладзечанца Вадзіма Гурмана па падзеях 9 жніўня ў горадзе.




Маладзечанца Вадзіма Гурмана асудзілі на 3,5 гады калоніі за акцыю 9 жніўня

Восьмага лютага ў судзе Маладзечанскага раёна быў вынесены прысуд Вадзіму Гурману, абвінавачанаму па ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэксу і па арт. 364 КК, за тое, што нібыта правакаваў натоўп на актыўныя дзеянні супраць міліцыі і пагражаў гвалтам міліцыянерам на акцыі 9 жніўня.

Адрас для лістоў: ПК № 9. 213410, г. Горкі, вул. Дабралюбава, 16

Даслаць паштоўку

Падтрымаць «Вясну»



Іншыя палітвязні



Іван Чарнаморчанка

Дата затрымання: 14 траўня 2022



Аляксандр Жмуро

Дата затрымання: 15 лютага 2021



Андрэй Навакоўскі


Дата затрымання: 24 лютага 2022




Ігар Токараў

Дата затрымання: 3 снежня 2021

Палітвязні знаходзяцца па адрасах:



Падтрымаць «Вясну»



СІЗА-1
220030, г. Мінск, вул. Валадарскага, 2
123 палітзняволеных

СІЗА-7
224030, г. Брэст, вул. Савецкіх памежнікаў, 37
16 палітзняволеных

Следчая турма № 8
222163, г. Жодзіна, вул. Савецкая, 22А
32 палітзняволеных

СІЗА-6
225413, г. Баранавічы, вул. Брэсцкая, 258 В
13 палітзняволеных

Паказаць больш

Апошнія навіны

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева
26.04.2023

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі
26.04.2023

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні
26.04.2023

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
26.04.2023

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя
25.04.2023

Больш навінаў

Што варта ведаць і як дапамагчы?

Падтрымаць «Вясну»

✉ Практычны дапаможнік па перадачах для вязняў ад “Вясны”

✉ Як зрабіць грашовы перавод зняволенаму?

✉ Наша сіла — ў салідарнасці! Вялікі дайджэст па дапамозе палітвязням

✉ Напішы ліст і адпраў паштоўку. Пра што і як пісаць?

✉ Як даслаць пасылку вязню і чаму гэта важна?

❤ Далучайся да ініцыятывы «Вызваленне-2020» (для родных палітвязняў)

❗ Што чакае асуджаных па палітычных справах пасля абвяшчэння прысуду?

ВЯСНА праваабарончы цэнтр

viasna@spring96.org

Падтрымаць «Вясну»